Факультэт
гуманітарыстыкі
і моўных камунікацый

# ЛІТАРАТУРНЫ AUTOGRAPHUM

*"О, хараство асенніх дзён празрыстых..."*

*Уладзімір Жылка*



№ 4
ВОСЕНЬ
2022



## *Шаноўныя філолагі, паважаныя аўтары і проста ўсе неабыякавыя чытачы!*

Прапануем Вашай увазе чацвёрты (восеньскі) нумар студэнцкага літаратурнага часопіса **“ЛІТАРАТУРНЫ AUTOGRAPHUM”**, які выходзіць у электронным фармаце. Нагадваем, што гэтае выданне для неабыякавых да літаратурнай творчасці, якія пішуць у любым жанры паэзіі, прозы, крытыкі, публіцыстыкі на мовах народаў свету.

Восень натхняе на паэтычныя творы і пераклады, прыгожая пара разнастайна адлюстравана ў літаратуры. Адчуць чароўнасць восеньскіх дзён Вам дапамогуць вершы нашых аўтараў, прасякнутыя цеплынёй і радаснымі ўспамінамі пра летні адпачынак. Для пачынаючых пісьменнікаў мы падрыхтавалі некалькі парад, якія дапамогуць распачаць творчую справу. Аматарам падарожжаў прапануем віртуальна наведаць родныя вёскі Янкі Купалы і Васіля Быкава. З чароўным светам “БібліяНочы” Вас пазнаёмяць нашыя карэспандэнты. У гэтым нумары можна пачытаць таксама і творы навучэнцаў Ліцэя ВДУ імя П.М. Машэрава і Полацкага каледжа ВДУ імя П.М. Машэрава.

З намі можна звязацца ў Viber, Telegram, а таксама праз электронны адрас, які змешчаны на апошніх старонках кожнага нумару.

Чытайце нас! Пішыце нам! Дзяліцеся нашымі публікацыямі! Дапамагайце чытачам адкрываць новыя імёны, а пісьменнікам - знаходзіць удзячных чытачоў. Часопіс размешчаны на галоўнай старонцы сайта ВДУ імя П.М. Машэрава (Галоўная-Універсітэт-Факультэты-Факультэт гуманітарыстыкі і моўных камунікацый).



*З павагай,*
*галоўны рэдактар Селязень Кацярына,*
*студэнтка 41-й групы ФГіМК.*



Сакуновская Мария

ФХБиГН, 41 группа, 4 курс

**Любимые авторы:**
В.С. Короткевич,
В.П. Некляев,
Ч.М. Паланик,
М.А. Булгаков.

**Кредо в литературном творчестве:** Пишу о том, что близко, что болит.

*Пишу о том, что болит, о том, что тревожит. Я не считаю, что мои стихи нечто выдающееся, они просто передают мои переживания, волнения и радости. Я не могу писать, когда меня просят, стихи рождаются порой в самый неподходящий момент, когда под рукой и листка бумаги нет. Многие, зная какой я жизнерадостный и весёлый человек по жизни, очень удивляются, что в моих стихах всё так мрачно и грустно. Однако именно благодаря им я и являюсь тем самым человеком. Мои стихи - отражение меня.*

***

Мы шли — нам мешали двери,
А ехать мешал хлам,
Отсутствие веры — верить,
Дожди — идти по следам.

Деньги дружить мешали,
А плавать мешали шторма,
А улыбаться — печали,
В тепло поверить — зима.

Нам думать звуки мешали,
А улыбаться — мечты.
Всему оправданья искали,
Худшие пряча черты.

***

Абдыму ўспамін.
У валасы запушчу свае рукі.
Удыхну пах прыемны.
Цёплы.
Твой.
Пацалую паветра.
Забараняю сабе плакаць.
І застануся сам-насам.
Адна.
З сабой.

# ПАЭЗІЯ



***

в моём мире война, в твоём мире цветы,
в твоём мире весна, в моём мире кресты.
без тебя мне не ждать, без меня тебе жить.
без меня можно спать, без тебя - хоронить.

без меня солнце восходит, без тебя вечно тьма,
без меня с тобой каждый, без тебя всё сама.
без тебя сердце плачет, без меня жизнь идёт,
без тебя быть на месте, без меня - лишь вперёд.

без меня бьет по ритму, без тебя бьет озноб,
без меня тихо куришь, без тебя плачь взахлеб.
без меня тебя любят, без тебя меня нет,
без тебя в жизни тени, без меня яркий цвет.

мне одной засыпать и одной же вставать,
каждый день, как молитву, себе повторять:
без тебя мне не ждать, без меня тебе жить.
без меня можно спать, без тебя - хоронить.

***

Сыплецца неба мільёнамі зор:
Гэта не попел, а дробны ўзор.
Сыплецца з неба пух ад гусей,
Свет закрывае ад брудных людзей.

Сыплюцца з неба мільярды агнёў,
Так прыляцеў да нас, быццам анёл,
Снег і ніколі ўжо не растае,
Ён, быццам птушка, над намі лятае.

І больш няма ні крыўды, ні жалю,
Толькі цяпер аднаго я жадаю,
Каб адзіноту маю перакрыў
Белы, халодны снегавы пыл.

***

Первый ноябрьский снег.
Думала, лучше для всех.
Думал, всегда будет рядом.
Думали, будто так надо.

Первый ноябрьский снег.
Сердце окутает льдом.
Будет бежать век.
Будет меняться дом.

Первый ноябрьский снег.
И в эту ночь не уснуть.
Закрыть лишь руками глаза
И одиноко тонуть.



*Писать стихи я начала в 6 классе, но осознанно к творчеству пришла в 14 лет. Это был особенный период, когда эмоции бурлили через край. Не думала, что буду писать на постоянной основе, так как я очень изменчивый человек. Мне всё очень быстро надоедает, но, видимо, написание стихотворений мне залегло глубоко в душу. На самом деле, стихи я сочиняю редко. Они всегда получаются душевными и сокровенными, отражают мой внутренний мир и состояние.*



## Курзова Александра

ФГиЯК, 102 группа, 1 курс

**Любимая книга:**
"Темные аллеи" Ивана Бунина.

**Любимая литературная цитата:**
"Чувства людей гораздо интереснее их мыслей" (Оскар Уайльд).

**Кредо в литературном творчестве:**
Писать по зову сердца. Главное качество, а не количество. Пусть лучше будет один-единственный стих, но он будет настоящий, не фальшивый. Он будет написан твоим сердцем, а не разумом.

***

Поговори со мной
О книгах, о цветах.
Поговори со мной
О звездах, о луне.
Узнай меня, узнаю я -
Какой на самом деле человек.
И чем является сознание его,
О чем он думает сейчас,
О чем мечтает,
Что за цель
Приводит его сюда вновь?
Не спрашивай,
Что делаю и как дела.
Сейчас не важно это.
Уж лучше расскажи,
Чего твои глаза горят
И почему я вижу в них костры?
Поведай чувства мне свои,
Всю боль и счастье передай.
Кто, как не я, сведет мосты,
Отправит прямо в май?

***

Мрачные дни близятся к нам:
холод и сумерки ночью,
серый и блудный вижу туман.
Я так проникнута нелюбовью...
Сколько сердец убились в ночи,
блуждая в темени осени?
Это не ты, это очи твои
тебя обманули и опрокинули.

***

как прекрасно находиться дома,
в родном гнёздышке, где ты рос.
все здесь мне родное и знакомое,
даже этот гнилой мост.

воздух летнего блаженства
разнесется в памяти моей.
запах этих детских развлечений,
память тех невинных дней.

пройденный этап не завершился.
память прошлого меня гнетёт.
снова дом мне мой приснился.
я проснулась, мамочка зовет.



***

О, уходящий мой закат!

Не уходи, дождись скорее

Мой посиневший, тёмный ВЗГЛЯД,

А кожа всё грубее.

Глаза не чувствуют ту боль,

Что ощутили год назад,

Все слёзы выела мне моль.

Внутри меня погас весь ад.





*В своём творчестве у меня было несколько этапов. Сначала я писала на темы чувств, внутреннего состояния человека. Была лирическая абстракция, когда внешний мир показан через эмоции и внутреннее героя. Но последние несколько лет я пишу сюжетные стихи, где рассказывается определённая история человека или животного. И, конечно же, я добавляю в стихотворение какой-либо философский подтекст, который, несмотря на скрытость, дает настроение стихотворению. Также я иногда экспериментирую с формами, стилями и жанрами, стараясь писать на других языках.*

## Даниленко Александра

**ФГиЯК, 32 группа, 3 курс**

**Любимая книга:**
"Над пропастью во ржи"
Д.Д. Сэлинджера.

**Любимая литературная цитата:**
"Часто сквозь видимый миру смех льются невидимые миру слёзы"
(Н.В. Гоголь, "Мертвые души").

**Кредо в литературном творчестве:**
Творить, пока творится; писать, пока есть о чём писать; стараться, пока есть, для кого стараться.

***

Талая вода
Течёт по крышам зданий.
Лицо всё в каплях.

***

На сочном лугу
Распускается солнце —
Жёлтый одуванчик.

***

Птицы улетают,
Падают перья с неба.
То снег идёт.



***

Щебечут птицы.
В тёплой долине гор
Мальчик смеётся.

***

Холодной ночью,
Включив старое
радио,
Почти плачет
старик.

***

Калмакор встал сегодня опять очень рано,
Потянулся, не сразу открывши глаза.
В хладно-алой заре утопала лесная поляна
И стояла, не двигаясь, ивы лоза.

Калмакор встрепенулся, рассыпав росу по травинкам,
Разбежался, и ветви вокруг затряслись.
Пробегая по явным и тайным тропинкам,
Стаи птиц стал будить, чтобы в высь поднялись.

А потом побежал он по норам и дуплам,
Разбудил всех волков, лисов, зайцев, ежей.
Оживив старый лес, Калмакор задержался под дубом,
И уселся, устав, меж могучих ветвей.

Столько много хлопот: приближается осень,
Надо листья раскрасить в оранжевый цвет,
Надо шишки встряхнуть с нежелтеющих сосен
И медведю на спячку дать дельный совет.

И встаёт Калмакор. Много лет он заведует лесом.
Серебрится на солнце его необычная шерсть,
А глаза смотрят вдаль, своим цветом подобны дюшесу,
Шевелятся хвосты (Калмакор их имеет шесть).

*працяг*

Умирает листва, вместе с нею и лес засыпает.
Калмакору становится жить всё трудней и трудней.
Он своими хвостами следы от зверей заметает,
Чтобы спрятать бедняг от недобрых людей.

Зайцам шубы меняет, ночами выводит туманы
И в болотах хранит много тайн, что нельзя открывать.
Раздаёт белкам рыжим большие каштаны,
Чтобы в землю они их могли закопать.

По ночам Калмакор зажигает огни над лугами,
Песню лесу поёт на бессловном немом языке.
Орошается лес от небес ледяными слезами,
Кромка льда выступает на тихой реке...

Калмакор провожает на юг перелётные стаи,
Сам едва ли не плачет, на лапах почти не держась.
Уже собраны на зиму все, что ни есть, урожаи,
Вся листва от ветвей на земле разлеглась.

Калмакор, улыбаясь, уходит к себе на поляну
И ложится, глаза цвета груши закрыв.
С неба падает снег. И, подобно большому гурману,
Всё съедает вокруг, Калмакора поглубже зарыв.

И стоит мёртвый лес, словно в саван одетый насильно.
Нет ни звука: природа зиме отдана.
Но наступит тот час, и капель вдруг польётся обильно:
Калмакор вновь проснётся. И снова наступит весна.

# ПАЭЗІЯ

秋天，黄色的枯叶躺在地上。
我能看到冬天吗?
我能看到祖国吗?
春天，树叶会重出现在树上。

**Дословный перевод:**

*Осенью на земле лежат жёлтые,*
*опавшие листья.*
*Смогу ли я увидеть зиму?*
*Смогу ли я увидеть родину?*
*Весной на дереве снова появятся*
*листья.*



**ЛЮСТЭРКА**

*Ты ўздыхаеш разгублена: “Восень...”*
*Паўтараю з усмешкай: “Во-во...”*
*Ды такая адчайная просінь*
*Над тваёю сівой галавой,*
*Так стараецца ранняе сонца*
*След начнога марозу схаваць,*
*Што я веру і ў лета бясконцасць,*
*І што нам на дваіх сорак пяць,*
*Заадно — што дажджу больш не будзе*
*І няма калі маме хварэць...*
*“Во-во-во...” — мы наіўныя людзі,*
*Як і ўсе, мы баімся старэць.*

*Ты растерянно охаешь: "Осень...”*
*Я с иронией вторю: “Ой-ой...”*
*Но отчаянно-яркая просинь*
*Над твоею седой головой.*
*Так старается раннее солнце*
*Растопить этот первый снежок,*
*Что я верю: остался на донце*
*Нам хмельного напитка глоток.*
*Заодно — что ненастья не будет*
*И что некогда маме болеть...*
*“Ой-ой-ой..." — мы наивные люди,*
*Как и все, мы боимся стареть.*





## Вольга Іванаўна Русілка

Дацэнт кафедры літаратуры, кандыдат філалагічных навук.

Аўтар зборнікаў паэзіі "Табе", "Ажына", "В.І.Р", "Сцежка, сцежачка, сцяжынка", падручніка па беларускай літаратуры для 8 класа (у суаўтарстве з І.М. Слесаравай і М.А. Лазаруком), вучэбных дапаможнікаў. Займаецца мастацкім перакладам. Лаўрэат літаратурных прэмій імя Уладзіміра Караткевіча, імя Петруся Броўкі Віцебскага аблвыканкама. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

### ***ДОМА***

*Туманок над ацiхлым прасторам,*
*Халадок ад азёрнае хвалi...*
*Трэба быць найвялiкшым акцёрам,*
*Каб слязiнкi з вачэй не ўпалi.*

*Каб слязiнкай самой не ўпасцi*
*Перад гэтай святой пякнотай,*
*А ламаць знерваваныя пальцы,*
*Задыхаючыся ад пяшчоты.*

*Ад любовi да роднага краю,*
*Да малой, да маленькай радзiмы.*
*Цi тут прымуць мяне, цi пазнаюць,*
*Цi даруе забыты любiмы?*

*...Халадок ад азёрнае хвалi,*
*Ды не я ў далёкiм чаўночку.*
*Тую песню, што мы спявалi,*
*Мне вяртае спагадная ночка.*

### ***МАМIНЫ КВЕТКI***

*Матылькi — так у нас дома*
*называюць кветку касмею.*

*У мамiным гародзе — матылькi,*
*Любiмыя яшчэ маёй бабуляй.*
*Памiж гуркоў i горкае цыбулi*
*У мамiным гародзе матылькi.*
*Прытуляцца пяшчотна да рукi,*
*Красой неспадзяванаю атуляць...*
*У мамiным гародзе — матылькi,*
*Любiмыя яшчэ маёй бабуляй.*



**СТУДЭНЦКІ ЎСПАМІН**

*Салодкі пах кавярань у сталіцы —
Студэнцтва майго першы прыпамін.
Як ад уздыху шкло, пагляд замгліцца,
Пакуль не дагаворым — не астынь.*

*Нязвыклы водар кавы у сталіцы
Вясковым дзецям тлуміць галаву.
І не паспееш нават надзівіцца,
Як "на раён" шляхі цябе завуць.*

*Я не хачу! Я ўжо амаль такая,
Як з Мінска аднакурсніцы мае!
Ды хто цябе, выдатніца, спытае,
Калі на вёсках "кадраў" не стае.*

*Багемным пахам кавы у сталіцы
Цяпер сама я галаву дуру...
Не-не, ды маладосць мая прысніцца,
Не-не, ды аглянуся на зару.*





**АДНАКУРСНІКАМ**

*Колькі гадоў прайшло...
Для мяне чарадзейная фраза:
“Мы вучыліся разам...”*

*Колькі ў нябыт адышло
настаўнікаў — нашых бацькоў...
Мы з імі — адзіная кроў.*

*Колькі вятроў адгуло...
Ў доме, дзе ўсё было першым,
намолены сцены вершам.*

*Колькі вадой сышло...
Дзякуй за гордую фразу:
“Мы вучыліся разам...”*

**ЖАРТАЧКІ**

*Ах, каханне-аханне,*
*Ад уздыхаў млосна.*
*Прывіднымі страхамі*
*Тлуміш сон дзівосны.*

*Ой, насніла-выснiла,*
*Аж сабе не веру!*
*Дзе падман, дзе ісціна,*
*Дзе сцяна, дзе дзверы?*

*Ці не на бяду маю*
*Б'ецца сэрца ў клетцы?*
*Пастаю, падумаю —*
*Землятрус у сэрцы.*

*Во спляла дарожаньку —*
*Што ні крок, то бокам.*
*Дарагі, харошанькі,*
*Выбачай — і з Богам!*

***

*Сцежка, сцежачка, сцяжынка...*
*Лёгкім подбегам дзяўчынка*
*па табе ляціць, знікае*
*ў квецені вясёлай мая.*

*Сцежка, сцежачка... Узмежак*
*на кавалкі долю рэжа.*
*Шлях няблізкі, шлях няроўны,*
*стомы і трывогі поўны.*

*Сцежка... Роўная ці злая,*
*ці да пекла, ці да раю,*
*на сляды не разбівайся,*
*покуль крочу — не канчайся.*

**ВЯРТАННЕ**

*Ціха-ціха-ціхутка*
*Я іду са спаткання.*
*І не знаю, ці хутка*
*Разгарыцца світанне.*

*Хто ж гадзіны лічыў,*
*Калі сэрцы спявалі,*
*А пяшчотны матыў*
*Закалыхвалі хвалі*

*І азёрнай красы,*
*І пяшчоты, і ласкі...*
*Адцвілі верасы.*
*Не вяртаецца казка.*

*На сцяжынках радзімых*
*Я няпрошаны госць.*
*Ціха-ціха, любімы.*
*Я іду ў маладосць.*

***

*А дома — яблыкавы пах*
*і вымыта хвашчом падлога.*
*І на бярозчыных плячах*
*Спялее млявая аблога.*

*Ліне апошні летні дождж,*
*Сыпне ў мамін твар, гарэза.*
*Запахне сонцам звялы хвошч,*
*Даспелым летам, светлым лесам.*

# 10 ЗАПАВЕДЗЯЎ ПІСЬМЕННІКА

## 1

У вас павінна быць больш за адну ідэі ў працы. Калі ў мяне ёсць выбар паміж напісаннем кнігі і марнаваннем часу, я абяру другі варыянт. Толькі калі ў мяне ёсць ідэя для дзвюх кніг, я выбіраю адну, а не другую. Мне заўсёды павінна здавацца, што я лянуюся.

## 2

Не будзьце адным з тых пісьменнікаў, якія прыгаворваюць сябе да жыцця, прысвечанага таму, што яны ўвесь час лісліваць іншым пісьменнікам.

## 3

Вядзіце дзённік. У сваім пісьменніцкім жыцці, больш за ўсё я шкадую пра тое, што ніколі не вёў дзённік ці часопіс.

## 4

Не піцьце ў грамадскіх месцах. Я думаю, што пісьменніцтвам можна займацца толькі ў адзіноце



ДЖЭФ ДАЕР – АНГЛІЙСКІ ПІСЬМЕННІК І ПУБЛІЦЫСТ, УЛАДАЛЬНІК ПРЭМІІ САМЕРСЭТА МОЭМА, ПРЭМІІ АМЕРЫКАНСКАЙ АКАДЭМІІ МАСТАЦТВА І ЛІТАРАТУРЫ І МНОГІХ ІНШЫХ. АЎТАР ЧАТЫРОХ РАМАНАЎ І СЯМІ ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫХ КНІГ, ПЕРАКЛАДЗЕНЫХ НА ДВАЦЦАЦЬ ЧАТЫРЫ МОВЫ СВЕТУ.

фота ўзята з інтэрнэт-крыніц

## 5

Практыкуйцеся кожны дзень. Зрабіце звычкайператвараць свае назіранні ў словы і, паступова, гэта стане інстынктам. Гэта найважнейшае правіла з усіх, і, натуральна, я яго не прытрымліваюся.

## 6

Сцеражыцеся клішэ. Нароўні з выразамі клішэ існуюць і клішэ зваротнай рэакцыі. Многія раманы, сярод якіх нямала адэкватна напісаных, з'яўляюцца формамі клішэ, адпаведныя чаканай рэакцыі ў адказ.

## 7

Шкадуйце. Гэта паліва. На старонках вашыя шкадаванні ярка ўспыхваюць, становячыся жаданнем.

## 8

Ніколі не турбуйцеся аб камерцыйных магчымасцях свайго праекту. Пакіньце гэта агентам і рэдактарам, няхай яны непакояцца, ці не. Вось размова паміж мной і маім выдаўцом у Амерыцы:

– Я пішу кнігу настолькі сумную, з такой нізкай камерцыйнай прывабнасцю, што, калі вы яе апублікуеце, яна, верагодней за ўсё, будзе каштаваць вам вашай працы.

– Гэта менавіта тое, што прымушае мяне працягваць маю працу.

## 9

Калі вы выкарыстоўваеце камп'ютар для працы, увесь час удасканальвайце і пашырайце параметры аўтакарэкцыі. Адзінае, чаму я застаюся верным свайму старому камп'ютару, складаецца ў тым, што я ўклаў шмат вынаходлівасці ў стварэнне аднаго з найвялікшых файлаў аўтакарэкцыі ў гісторыі літаратуры. Ідэальна сфармаваныя і запісаныя словы ўзнікаюць толькі пасля некалькіх кароткіх націскаў клавіш: "Ніц" становіцца "Ніцшэ", "фой" становіцца "фатаграфіяй" і г. д. Геніяльна!

## 10

Ніколі не ездзіце на ровары з уключанымі тармазамі. Калі нешта аказваецца занадта цяжкім, здайцеся і зрабіце што-небудзь іншае. Старайцеся жыць, не звяртаючыся да настойлівасці.
Але ўся пісьменніцкая дзейнасць – гэта настойлівасць. Вы павінны быць настойлівым. Калі мне было трыццаць, я хадзіў у спартзалу, хоць і ненавідзеў гэта. Мэта наведвання спартзалы складалася ў тым, каб адкласці той дзень, калі я перастану рухацца. Вось чым пісьменніцтва з'яўляецца для мяне: спосабам адтэрмінаваць той дзень, калі я не захачу больш гэтага рабіць, той дзень, калі я апускаюся ў настолькі глыбокую дэпрэсію, што яна будзе неадрозная ад дасканалай асалоды.

Падрыхтавала
Дзіяна ГАЛАВАЧ

*Меня всегда интересовали иностранные языки и то сознание, которое они несут в себе. В процессе перевода или написания уже своих стихов, мне будто предоставляется возможным выйти за границы окружающего языкового поля, заглянуть чуть дальше.*



## Метелица Александра

**ФГИЯК, 3 курс, 303 группа**

**Любимая книга:**
"Кафка на пляже"
Харуки Мураками.

**Любимая литературная цитата:**
"Реальность только одна. Всегда. Что бы с тобой ни происходило. Реальность, куда ни кинь, - очень одинокая и холодная штука".

**Кредо в литературном творчестве:**
Пока люди способны чувствовать, творчество не умрёт, а значит, и мы будем жить вечно.

### По праву памяти
Александр Твардовский

Смыкая возраста уроки,
Сама собой приходит мысль —
Ко всем, с кем было по дороге,
Живым и павшим отнестись.
Она приходит не впервые.
Чтоб слову был двойной контроль:
Где, может быть, смолчат живые,
Так те прервут меня:
— Позволь!
Перед лицом ушедших былей
Не вправе ты кривить душой, —
Ведь эти были оплатили
Мы платой самою большой...
И мне да будет та застава,
Тот строгий знак сторожевой
Залогом речи нелукавой
По праву памяти живой.

*Арыгінал*

## Living mind

Summing up the lessons of the age,
The thought just comes without warning -
Refer to everyone with whom were on the stage,
It has no sense how deep they're going.

This thought appears not only once.
It needs controlling every speech,
And when the living would keep silence,
The dead would interrupt me:
- Please!

You have no right to be impure,
When facing old forgotten truths,
They cost too much, you must be sure -
Much more than anything else could...

The pledge of speech will not be wily
Due to the strength of living mind,
But all the obstacles will hardly
Be your good comrades in a fight.

*Translation*



## Сайко Юлия

Учащаяся 10 "Б" класса
лицея ВГУ имени
П.М. Машерова.

***

*Просто дождь всё так
же льёт под ноги
отраженья мёртвых
городов.
Топают усталые
немногие,
растекаясь пятнами
зонтов.*

***

*Особняк —
шляхетская
обитель,
маркером
расписанный забор.
Мне провидец
ворон-долгожитель
каркнул, как Эдгару,
"Nevermore".*

***

*На мосту, прижавшись к
огражденью,
ждёт ладьи озябшая
душа.
Ветер, потерявший
направленье,
спит бесшумно в мягких
камышах.*

***

*Голос плыл, как пар над
чашкой чая,
вроде мой, но, всё-таки,
ничей.
Ты меня переживёшь,
качаясь,
на сплетеньи солнечных
лучей.*

***

*В переходе посиневший
нищий
ищет сушу, как скиталец
Ной.
На ладони — девять линий
жизни
каплей перечёркнуты
одной.*

***

*А за спиною — миражи, звук надоедливого рока.*
*"Мне совершенно всё равно, где совершенно одиноко".*

*Как старых мойр веретено, сплетаются пространство, судьбы;*
*И, шедши об руку крыло, расходимся на перепутье.*

*Прогорклый дождь стучит копьём в непробиваемые щели.*
*Ты семь морей прошёл затем, чтоб затонуть на первой мели.*

*За перекрёстком — переход, ночь запорошат снега мошки;*
*И пальцы рук, и жизни нить — в узлах, как колыбель для кошки.*

*Под сенью туч, под светом звёзд, две грани сна — двух жизней древо...*
*Наш путь разрезали ножом — мне до небес, тебе — налево.*

***

*А вообще — безразлично. Наденьте-ка*
*шляпу,*
*мостовую впечатайте в гулкий каблук,*
*в тонкий плащ заверните душонку*
*измятую*
*под дождя равнодушно-занудливый стук.*

*Что вам стоит зонтом заслониться от*
*времени,*
*прошагать Маяковским по лесенке чувств?..*
*Только кажется — что-то в дороге*
*потеряно,*
*что-то было в тебе, что уже не вернуть.*

*Едкий газ не оставит ни вдоха, ни выдоха,*
*станет дождь разноцветный*
*равнодушным к тебе...*
*И тогда обернись, в тщетных поисках*
*выхода,*
*растворяясь, как хлор, в помутневшей*
*толпе.*



***

*С юга дул простудившийся ветер,*
*поворачивал флюгеры вспять.*
*В мои косы вплетались созвездия —*
*я с тех пор разучилась спать.*

*И теперь полутени по паркам*
*собираю пригоршней в блокнот.*
*Меня греет облезлая парка,*
*защищает фамильный зонт.*

*Мысли-волки сбиваются в стаю,*
*воет вслед автострады кольцо.*
*Я, как пазл, собирать устала*
*по осколкам твоё лицо.*

*Может, долгой дорогою вспоротый,*
*ты рассыпался в пепельный снег?*

*Соберу тебя, спрячу за воротом*
*от усталости, вёрст и лет.*

*Ты протянешь замёрзшую руку*
*перебросить над пропастью гать.*
*Нас бросает навстречу друг другу,*
*чтоб потом друг у друга отнять.*

*Тебе — в путь, и бродить, ровным счётом,*
*по кругам (видно, Данте был прав).*
*Мне — упасть и не встать, превращённою*
*ранней осенью в листопад.*

Полацкі каледж ВДУ імя П.М. Машэрава



Нужина Кристина

Учащаяся 1 курса специальности "Музыкальное образование" Полоцкого колледжа ВГУ имени П.М. Машерова.

## ДВА ДРУГА В МОРЕ

*Ночь, душа спокойна,*
*Волны плещут неспеша,*
*На берегу, смотря на море,*
*Долго думали друзья.*

*Две души, два друга в море,*
*Каждый мыслил о своём.*
*И тонули эти мысли*
*В море чистом голубом.*

*Ночью в море очень тихо,*
*Только слышен плеск воды.*
*И маяк, давая свет свой,*
*В даль отправил корабли.*

*Две души, два друга в море,*
*Пришли*
*с целью ждать рассвет.*
*И когда проснулось солнце,*
*Погасил маяк свой свет.*



## Я ПРИЕХАЛА ДОМОЙ

*Я приехала домой,*
*В край красивый, дорогой.*
*Где душе моей спокойно,*
*Где уютно и комфортно.*

*По пути заеду в поле,*
*Где красивые просторы.*
*Там ромашек соберу*
*И всё маме подарю.*

*Наконец, проделав путь,*
*За порог смогу шагнуть.*
*Дома маму обниму и на*
*ушко прошепчу:*
*"Я приехала домой*
*в край красивый, дорогой..."*



Полацкі каледж ВДУ імя П.М. Машэрава



Приставко Валерия

Учащаяся 2 курса специальности "Иностранный язык" Полоцкого колледжа ВГУ имени П.М. Машерова.



## *ВЫХОДЯ НА НОЧНУЮ АЛЛЕЮ*

*Выходя на ночную аллею,*
*Чёрной кошки увижу следы.*
*Ни о чём я уже не жалею,*
*И завяли в душе цветы.*

*Та кошка походкой умелой*
*Обманет судьбу без труда.*
*Хотелось бы мне быть столь смелой*
*И манить тебя за собой, туда.*

*Аккуратно шагая по тропке,*
*Не нарушая звенящую тишь,*
*Она расставит свои уловки*
*И ты попадёшь, как мышь.*

*Спуская занавес на сцене,*
*Загадка остаётся среди нас.*
*Как драгоценная жемчужина в пене,*
*Как в египетских рунах глаз.*

## *НЕ*

*Не снись, не дари улыбку*
*Или я не захочу проснуться.*
*Не дразни меня, золотая рыбка,*
*Я желаю к тебе прикоснуться.*
*Не мани меня, не зови*
*Или я зависимой стану.*
*Не терзай мою душу, не рви,*
*Я сама в руках твоих растаю.*
*Ты не плачь, меня не жалей,*
*Растворись в душе моей пеплом.*
*Холодным ветром среди аллей*
*Прошепчи мне пару сладких реплик.*

Полацкі каледж ВДУ імя П.М. Машэрава



Ковшель Елизавета

Учащаяся 3 курса специальности "Начальное образование" Полоцкого колледжа ВГУ имени П.М. Машерова.

***

*Любоў да Радзімы жыве ў маім сэрцы,*
*І тут сапраўды мы знайшлі сваё месца.*
*Родным я краем сваім ганаруся,*
*Не пакіну ніколі сваёй Беларусі.*
*Тут жывуць мае сябры,*
*Будуюць хаты і бабры.*
*Тут усім знойдзецца месца,*
*І не патрэбен нам ключ,*
*каб адкрыліся дзверцы.*
*Шмат азёраў у нас празрыстых,*
*Чуем звон і рачулак срабрыстых.*
*Багата краіна на зялёны лясы,*
*Чуем у небе птушанят галасы.*
*Шмат разоў за мяжой я бывала,*
*З іншаземцамі там размаўляла.*
*Ёсць шмат розных краін у свеце,*
*Але Беларусь для мяне на першым месцы.*



**Дождь**

*Идёт дождь и плохое смывает.*
*На путь раздумий он нагоняет.*
*Становится как-то спокойно, легко,*
*Мыслей пространство здесь велико.*
*Приятно засыпать под шум дождя,*
*Проходит он, негативы крадя.*
*В то же время природа ликует,*
*Капли дождя лес зачаруют.*
*И вот к нам снова утро пришло,*
*Оно нам надежду в сердце зажгло.*
*Солнце осветило блестящие капли,*
*И в луже детишки пустили кораблик.*



Полацкі каледж ВДУ імя П.М. Машэрава



Кухлеўскі
Максім

Навучэнец 3 курса
спецыяльнасці
"Пачатковая адукацыя"
Полацкага каледжа
ВДУ імя П.М. Машэрава.

## ***Мой лёс***

*Хоць я — пераемнік Купалы і рускіх паэтаў —*
*Нямала гадоў прысвяціў перакладам і вершам,*
*Шмат знаю я годных асоб, і не бачу сакрэта*
*У тым разуменні, што я тут далёка не першы.*
*Не першы... І што? Можа быць, я не буду вядомы —*
*Гісторыя судзіць, працягне ці творца жыццё,*
*Ці знікне мой лёс, за ім вершы, радкі, мае словы...*
*Ці трапіць мой шлях у бяздонне, часоў небыццё...*
*У кожнага з нас ёсць свая асабістая мэта,*
*Якая вядзе за сабою святлом ліхтара.*
*Яна ж і будуе людзей — і будуе паэта,*
*І словы яго пераносіць на справы яна.*
*І мэта мая — не гісторыі цёмныя воды,*
*А душы, якім я прынесці павінны прамень,*
*Каб сэрцы народаў і творцаў адчулі свабоду,*
*Каб дзесьці ўнутры запаліўся вялікі агмень...*
*Не трэба народаў. Мне слава зусім не патрэбна.*
*Калі хоць адзін мой адчуе на сэрцы агонь,*
*Ужо буду ведаць, што праца мая недарэмна,*
*І шлях выраканца быў добрай дарогай маёй.*
*Тады і калі непрытомны я злягу на ложку,*
*І смерць мяне будзе чакаць дзесьці там, ля акна —*
*Я ледзь усміхнуся і вочы заплюшчу патрошку,*
*Бо буду я ведаць: жыццё я пражыў недарма.*

## *Залатыя ліхтары*

*Вось ён — мой шлях у святле залатых ліхтароў:*
*Ціхая зорная песня начных гарадоў...*
*Толькі пачуеш — яна павядзе за сабой,*
*Выйшаўшы з хаты так проста згубіцца у ёй...*
*Хай жа нясе мяне ціхая песня яго —*
*Горада мрояў — і не зразумеўшы таго,*
*Знікну я ў ім, нібы знічка, з планеты Зямля...*
*З ім — маё цела, і сэрца, і думка мая!*
*Слухай мяне ты, на жаль, незнаёмы спадар:*
*Гэта не проста агні, а дарога да мар!*
*Колькі б не крочыў — ніколі не знойдзеш нідзе*
*Тое, што засціць, прыцьміць, або знішчыць яе!*
*Зорка за зоркай — трымай той няўстойлівы шлях:*
*Вера з Надзеяй зіхцяць у маленькіх агнях...*
*Толькі крані — і адчуеш, як іншым ты стаў,*
*Знойдзеш сярод іх ты тое, што доўга шукаў!*
*Сонца прамень у святле залатых ліхтароў:*
*Ноччу з ім тысячы мар гарадскіх жыхароў...*
*Ціхаю песняй іх душы вядзе за сабой,*
*Тыя знаходзяць у ім цеплыню і спакой.*



## Крылы

**пераклад верша "Крылья" И.Кормильцева**

*Ты зняла вечарову сукенку, нібы няма мяне.*
*І я бачу свежыя шнары на гладкай, як шоўк, спіне.*
*Мне хочацца плакаць ад болю, і раптам забыцца ў сне...*
*Дзе твае белыя крылы, што так падабаліся мне?*
*Дзе твае крылы, што так падабаліся мне?*
*Дзе твае крылы, што так падабаліся мне?*
*Калісьці не ведалі смутку, цяпер толькі справа адна:*
*Даказваць, што сільны жрэ слабых,*
*Даказваць, што паліць вада.*
*Мы ўсе пакідалі нешта на гэтай шалёнай вайне...*
*Дарэчы, дзе твае крылы, што так падабаліся мне?*
*Дзе твае крылы, што так падабаліся мне?*
*Дзе твае крылы, што так падабаліся мне?*
*Я не пытаю цябе ні пра грошы, ні нават пра колькасць мужоў.*
*Я бачу, ты баішся адчыненых вокнаў, як фіялка вятроў.*
*А калі заўтра пачнецца пажар — і паверх увесь будзе ў агні —*
*Мы загінем без гэтых крылаў, што так падабаліся мне...*
*Дзе твае крылы, што так падабаліся мне?*
*Дзе твае крылы, што так падабаліся мне?*

Анастасія Сіманковіч, Вольга Карпава, ФГіМК, 31-я гр.

## Кнігі і... крыху чарадзейства: адным вечарам у бібліятэцы

Штогод у нашай краіне 15 верасня адзначаецца Дзень бібліятэк. З гэтай нагоды супрацоўнікамі цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя М. Горкага была арганізавана акцыя “БібліяНоч-2022”. Такую імпрэзу студэнтам ФГіМКу нельга было пакінуць без увагі. Адпраўляемся ў бібліятэку...

Падышоўшы да запланавага месца, убачылі: колькасць патэнцыйных удзельнікаў мерапрыемства невялікая. Але варта было крыху пачакаць, вольнага месца на пляцоўцы амаль не стала. На гадзінніку 19:00 – адкрыццё свята пачынаецца.




Усіх гасцей напачатку імпрэзы прывітаў заслужаны любіцельскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль танца “Лявоніха”. Пасля чаго з прывітальным словам да гасцей звярнуліся начальнік аддзела культуры Віцебскага райвыканкама Наталля Шыянок і намеснік старшыні адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Таццяна Ігнаткова. Затым дырэктар цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Алена Багацёнак запрасіла ўсіх у “начное” падарожжа па краіне кніг.

Прастора вячэрняй праграмы ахоплівала адразу ўсе паверхі бібліятэкі. Таму прысутнічаць хацелася на ўсіх пляцоўках адначасова.

Першым, што мы наведалі, стаў “Бібліятэчны подыум” – дэманстрацыйнае шоу народнага тэатра моды “Стыль” Віцебскага індывідуальна-педагагічнага каледжа. Гледачам пашчасціла ўбачыць арыгінальныя беларускія строі рук саміх студэнтаў. Ідзём далей...





У гэты час на першым паверсе ўжо праходзіць конкурс хуткага чытання, дзе мы паспелі паўдзельнічаць. Пераможца атрымаў сімвалічны падарунак ад арганізатараў імпрэзы. Далей нам пашчасціла сустрэцца з Віцебскім паэтам, мастаком Дзмітрыем Рубанікам, з Ганнай Чумаковай, якая прадставіла літаратурна-музыкальную праграму. Сапраўдным падарункам для ўсіх, хто неабыякавы да "жывой" музыкі, стала выступленне камернага хору Цэнтра культуры "Віцебск". Шматлюдна было і на майстар-класах, дзе можна было пазнаёміцца з рознымі тэхнікамі па вырабу выцінанак, ляляк-абярэгаў.

Сярод шэрагу мерапрыемстваў усе госці БібліяНочы мелі магчымасць прайсці квест "У пошуках рэцэпта шчасця". Супрацоўнікамі бібліятэкі былі прапанаваны заданні, якія трэба выканаць менавіта падчас усіх галоўных падзей. Мы таксама вырашылі "пашукаць рэцэпт свайго шчасця".

У адным з выпрабаванняў трэба было знайсці ўсіх соў, якія "разляцеліся" па бібліятэцы і падлічыць іх колькасць. Цяпер дакладна можна сказаць, што дэтэктывы з нас удаліся. Мы з лёгкасцю знайшлі зашыфраваныя прозвішчы пісьменнікаў Віцебшчыны.



Ці былі вы калі-небудзь у дзіцячых джунглях? А вось мы спрабавалі там знайсці адказы на загадкі. Акрамя таго, мы пазнаёміліся з незвычайным бібліятэчным гадзіннікам, бо вызначалі, якую ж кнігу можна прачытаць пасля трэціх пеўняў.

Расшыфраваць сказ на парасячай латыні? І гэта нам пад сілу. Знайсці сімвал добрых навін у царстве казачных нячысцікаў, прачытаць сказ пры дапамозе люстэрка, разгадаць кніжны рэбус пры дапамозе падказак - усе гэтыя заданні стварылі бібліятэкары для сваіх любімых чытачоў. За выкананне ўсіх заданняў квэста мы атрымалі салодкі прыз.

Вось так студэнты-філолагі знайшлі "рэцэпт шчасця" ў Бібліятэцы імя М. Горкага падчас БібліяНочы.

Фота Анастасіі СІМАНКОВІЧ

Сіманковіч Анастасія, ФГіМК, 31-я гр.

## У Вязынцы

Лета. Чэрвень. Вязынка. Цёплы сонечны дзень. Спякота і зяляніна паўсюль. Даносяцца гукі цягніка з прыпынку. Хутка з'явіцца наплыў турыстаў альбо звычайных адпачывальнікаў.




У гэтай вёсцы знаходзіцца месца сілы, так звычайна кажуць пра мястэчкі, у якіх нарадзіліся нашы вялікія землякі. Ці задумваліся вы: адкуль бярэцца талент і натхненне? Вось адсюль, усё пачынаецца з калыскі, з жывапісных прыродных краявідаў, са спакою, з цішыні, з павольнасці. У такія прыродныя пейзажы нельга не закахацца.

Ідзём па сцежцы, злева ўзвышаецца бюст пісьменніка-юбіляра, Янкі Купалы. Трэба абавязкова зрабіць фотаздымак, а то ў наш час не сфатаграфаваўся — значыць, не быў.

Працягваем хаду па каменнай дарозе, ужо крыху відаць вугал хаты. Яшчэ некалькі крокаў і, нарэшце, нашаму погляду адкрываецца невялікі дом з бярвенняў, з драўлянным дахам, з тагачасным плытом. На сцяне вісіць шыльда з надпісам: "25 чэрвеня 1882 года у гэтай хаце нарадзіўся Янка Купала — Народны паэт Беларусі". Абмінаем хату і знаходзім за ёй прыступкі з парэнчамі, якія вядуць уніз да сажалкі. Так адразу і не скажаш, штучны гэта вадаём ці стварыла яго прырода, але дакладна можна вызначыць, што з гэтай лакацыі толькі і пісаць карціны.



Пераходзім у галоўны пакой хаты. Справа ад нас, як заўсёды, размешчана сапраўдная сялянская белая печ. Збоку ад печы стаяць ложкі, а побач з імі вісіць калыска, злева стаіць стол, засцелены белым абрусам, са збаночкамі, пакрытымі ручнікамі. Паднімаем галаву вышэй і бачым: абразы ў чырвоным куце, недалёка ад стала знаходзіцца калаўрот, каля яго яшчэ адзін куфар. Увесь пакой перадае нам каларыт дзяцінства паэта.



Прайшоўшы ўздоўж хаты, можна патрапіць да старых магутных дрэў: дубоў, бяроз, ліп. Дрэвы высокія, кара абрасла лішайнікам, а лісце такое зялёнае-зялёнае, што можна параўнаць іх з бацькамі і дзецьмі, якія яшчэ не зразумелі адзін аднаго і не дамовіліся паміж сабой: як павінна ў цэлым выглядаць магутнае старое дрэва? Калі абдымаць яго, яно нібы дзеліцца сваёй моцаю з намі, аддае частку сябе, частку спадчыны, якая засталася нам спакон вякоў ад прадзедаў.

Калі вы вырашылі пайсці не ўздоўж хаты, а убок, далей па каменнай сцежцы, то трапіце на мосцік, які яднае рачулку і той самы вадаём з малюнка мастака. На беразе, каля маста, расце плакучая вярба. Адзін яе сук так нізка нахіліўся да вады, што сапраўды здаецца, што дрэва плача. Плача альбо чакае, каб хто-небудзь узлез на яго і спусціў ногі ў летнюю цёплую, як малако, ваду, а можа, каб на ім сядзелі русалкі і спявалі свае містычныя песні...

Прыгожае, таемнае, моцнае, спакойнае, ціхае месца. Адна з самых прывабных беларускіх частак краіны, у якой трэба пабываць кожнаму беларусу.





Рымша Ульяна, ФГіМК, 31-я гр.

## Маленькае падарожжа на Вялікую зямлю

Адным днём, у самым разгары лета мне давялося наведаць малую радзіму вялікага беларускага класіка літаратуры – Васіля Быкава – вёску Бычкі.

На небе ўжо красаваўся вялікі жоўты дыск сонца, які сваімі промнямі пазбаўляўся слядоў учарашняй непагадзі. Шлях быў доўгі, але мяне і маіх спадарожнікаў гэта не пужала. Наадварот, кожнага з нас захаплялі прыгожыя краявіды, якія змяняліся то густымі і непралазнымі лясамі, то палямі і галубымі азёрамі – вачамі Віцебшчыны. Мабыць, у адным з іх купаўся сам Васіль Уладзімравіч!



Дарога месцамі пятляла (яна была пакладзена падчас вайны). Лічылася, што такім чынам ваенны самалёт не зможа знявечыць калону машын, якая едзе па гэтай дарозе. Адразу думаецца: “Нават шлях шэпча нам пра пісьменніка, які пісаў ваенную прозу!”.

Праз некалькі гадзін перад намі самотна стаяў маленькі домік. Жыхароў у ім ніколі не было. Але памяць у ім жывая па сённяшні дзень. Тут размяшчаецца сядзіба-музей Васіля Быкава. Каля яе стаіць вялікі валун з партрэтам пісьменніка, які нагадвае сапраўднае месцазнаходжанне яго хаты.

Сама ж вёска Бычкі, якая ўзрасціла таленавітага беларускага пісьменніка, невялікая. Сёння ў ёй жыве каля дваццаці чалавек. У той самай вёсцы знаходзіцца школа, дзе Быкаў скончыў першы клас. Гэта звычайная вясковая хата. Вось як расказваў пра яе пісьменнік у сваёй кнізе “Доўгая дарога дадому”: “Школа ў вёсцы арганізавалася на мяжы 30-х гадоў, спярша гэта была пачатковая школка ў сялянскай хаце. Хата тая і дасюль стаіць, пасля вайны ў ёй жыў мой брат Мікола. А тады гаспадары проста перасяліліся ў трысцен, а большы пакой аддалі пад школу. Там паставілі два даўгія сталы і сабралі чалавек пятнаццаць вясковай драбнаты. Настаўнікам быў Антон Васільевіч Аўласенка з вёскі Дарошкавічы. Дарэчы, ягоная дачка жыве ў Мінску, замужам за



старэйшым Машэравым. Сталася так, што ўсе мае сябры былі старэйшыя за мяне і пайшлі ў школу раней, а мне толькі шэсць год. Сяджу адзін дома, а ў школе штосьці адбываецца цікавае, і я таксама хачу туды. Тады аднойчы бацька ўзяў мяне за руку і павёў да настаўніка. Пагаварыў з ім, і Антон Васільевіч кажа: хай ходзіць. Даў мне сшытак, пяро, а Валодзя Галавач, з якім я хадзіў на возера, павёў на замерзлае балота, акуратна зрэзаў ножыкам чарацінку, уставіў туды пяро. І пачаў я вучыцца".





Але вернемся да сядзібы Быкава. Сапраўдная скарбніца была ўнутры музея. Вакол знаходзіліся рэчы, якія былі звязаныя з жыццём і творчасцю пісьменніка. У адным баку пакоя стаіць ложак, яго засцілаюць покрывам з беларускай вышыванкай. Як толькі бачыш гэта, адразу прадстаюць перад вачыма старыя, але такія цёплыя бабуліны рукі, якія робяць шывок за шыўком. На сцяне размяшчаюцца памятныя фотаздымкі Васіля Быкава з роднымі і блізкімі сябрамі. Сярод іх хутка пазнаеш і Рыгора Барадуліна – яго таленавітага земляка, які быў сапраўдным сябрам Быкаву.

У некалькіх кроках ад ложка стаіць стол. На ім – неверагоднае – малюнкі і лісты з фронта, напісаныя рукой самога класіка. Як пацверджанне вялікага таленту пісьменніка ў хаце кідаецца ў вочы вялікая паліца з яго творамі. Бясспрэчна можна сказаць, што ў кожнага беларуса ёсць любімы твор Быкава, які не пакінуў абыякавым.

У гэтым месцы любы чалавек, які з павагай ставяцца да сваёй Радзімы і роднай мовы, будзе адчуваць гонар, што дакрануўся да гісторыі свайго народа і за то, што меў магчымасць наведаць гэтыя мясціны.





26 лістапада 2022 года спаўняецца 92 гады з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча.

Паэт, празаік, драматург, эстэт, літаратурны крытык, сцэнарыст, перакладчык, публіцыст – усё гэта і ёсць Уладзімір Караткевіч. Яго творчасць з'яўляецца выключнай з'явай беларускай літаратуры XX стагоддзя. Асаблівы ўклад пісьменнік унёс у развіццё беларускай гістарычнай прозы.

## У векавечнай бацькаўшчыне клёны

У векавечнай бацькаўшчыне клёны
Нячутна пачынаюць аблятаць
На рыжую траву, на мох зялёны,
На весніцы, на ціхі стаў, на гаць.

Зямля глядзіць азёрамі-вачыма
На ясны свет, што стыне у красе.
Як чыста, бы святло абшары вымыла,
Як ціха – быццам зніклі людзі ўсе.

Адвечная мая! Ў сцюдзёных росах,
Як летась, як мільёны год таму...
Ляцяць на ветры косы рыжай восені,
І кліча лісцяў жоўты сум зіму.

*працяг*

На вуснах стыне горкі смак рабіны,
Цалую іх, халодныя як лёд.
О вы, што будзеце ісці з дзяўчынай
Пад тымі ж клёнамі праз сотню год,

Ці зразумееце, што мы кахалі,
Што зніклі так, як знікнеце і вы,
Што векавечны толькі край, і далеч,
І жоўты ліст на зелені травы,

Што ў векавечнай бацькаўшчыне клёны
Тысячагоддзі будуць аблятаць
На рыжую траву, на мох зялёны,
На весніцы, на ціхі стаў, на гаць,

Што нездарма яны з асінак рудых,
Калі ідзеш увосень па зямлі,
Раняе золата пад ногі людзям,
Каб мы яе любілі й берaглі.

*Уладзімір Караткевіч*

## *У 2022 годзе адзначаецца 140-годдзе з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа.*

### Адцвітанне

Не шасцяць каласы,
Звон не валіцца з касы,
Не кладуцца ў стог пласты,
Толькі сыплюцца лісты
На яловыя кусты,
На сухія верасы.

Не іскрыцца небазор,
Не цвіце трава-чабор,
Не цыгліць птушыны стан,
Толькі поўзае туман,
Вецер б'е ў нямы курган, —
Шапаціць імглісты бор.

Змога вольная снуе,
Вочы ўставіўшы свае,
То галубне, то пужне.
Сэрца б'ецца ў паўсне,
Думка сэрцу аб вясне
Здрадны голас падае.

***Янка Купала***

### Восень

Пуста ў лузе. Толькі стогі
Парыжэўшыя стаяць,
Ды шпакі каля дарогі
Цэлы дзень адно крычаць.

Грэчка зжата. Гола ў полі.
Жыта звезена даўно.
Толькі плаваюць на волі
Кучы хмар, як валакно.

Дожджык сее беспрастанку;
Вецер свішча так, як звер...
Колькі лужын каля ганку!
А гразі, гразі цяпер!

Ссохлі травы, ўсё павяла.
Слоць, плюхота, холад, цьма.
Эх, скарэй бы закрывала
Зямлю чорную зіма!

***Якуб Колас***

## Факультэт гуманітарыстыкі і моўных камунікацый
## ПРАГРАМА
## ФЕСТЫВАЛЮ БЕЛАРУСКАГА СЛОВА
### "Якуб Колас і Віцебск: ад пакалення да пакалення"
(праходзіць з 05.12.2022 па 09.12.2022)

| Дата | Час | Месца правядзення | Назва мерапрыемства | Адказныя за правядзенне | Удзельнікі |
|---|---|---|---|---|---|
| Панядзелак 05.12.2022 | 12.00 | ФГіМК, актавая зала<br>хол 6-га паверха | Адкрыццё фестывалю "ДваЯ.Кія"<br>Народныя гульні | Студэнты 22 групы, Зайцава К.А., выкладчыкі<br>Студэнты 10 групы | Студэнты ФГіМК, выкладчыкі |
| Аўторак 06.12.2022 | На працягу дня | 601 аўд.<br>хол 6-га паверха | Дзень беларускага тэатра (да 140-годдзя Якуба Коласа) "Якуб Колас і Віцебск" (тэатральная мезансцэна)<br>Народныя гульні | Катовіч Т.В.<br>Студэнты 11 групы | Студэнты ФГіМК |
| Серада 07.12.2022 | На працягу дня | ФГіМК Літаратурны музей<br>хол 6-га паверха | Дзень беларускага музея "Віцебшчна ў жыцці і творчасці класікаў беларускай літаратуры"<br>Народныя гульні | Гладкова Г.А., Півавар К.С.<br>Студэнты 101, 103 груп | Студэнты, выкладчыкі, ліцэісты |
| Чацвер 08.12.22 | На працягу дня | ФГіМК, хол 6-га паверха | Дзень студэнцкай творчасці Прэзентацыя hand-made прадукцыі "Мая купалаўская/коласаўская спадчына"<br>Народныя гульні | Мартынкевіч С.В., Зіманскі В.Э., Семянькова Г.К. Студэнты 102 групы | Студэнты і выкладчыкі |
| | | | Прэзентацыя часопіса "Літаратурны Autographum" № 1 | Навасельцава Г.В. | |
| Пятніца 09.12.22 | На працягу дня | ФГіМК, хол 6-га паверха чытальная зала | Закрыццё фестывалю "Нацыянальна-культурная спадчына" (гульня "Яшчур") | Падстаўленка В.Ф., Бераснева А.М. | Студэнты і выкладчыкі |

# *Восень*

*О, хараство асенніх дзён празрыстых,*
*Бязгутарнасць прыроды і спакой.*
*Урачыста полем з пушчаў залацістых*
*Прыйшла туга і пала над вадой.*

*А там застыла яснасць даляў чыстых*
*Над цёмнай рунню й чорнай цалінай,*
*І холад лёгкі ў косах прамяністых*
*Разліла сонца хваляй нежывой.*

*Наўкол сляды павольнага канання*
*І веліч нетутэйшага маўчання.*
*Прымаю корна сон зямлі азурны.*

*І летуціцца сцішанай душы*
*Такі ж спакой, халодны і бязбурны,*
*І адцвітанне яснае ў цішы.*

*Уладзімір Жылка*

**Рэдакцыйная калегія часопіса:**
**Аксянчук Ганна Яўгенаўна —** кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры літаратуры;
**Бароўка Ванда Юльянаўна** — доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры літаратуры;
**Здольнікаў Віктар Віктаравіч** — кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры літаратуры;
**Крыклівец Алена Уладзіміраўна** — доктар філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры літаратуры, член Саюза пісьменнікаў Беларусі;
**Лапін Іван Людвігавіч** — кандыдат філалагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры літаратуры;
**Русілка Вольга Іванаўна** — кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры літаратуры, член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

**Галоўны рэдактар часопіса:**
**Селязень Кацярына Яўгеньеўна** — студэнтка 4 курса ФГіМКа спецыяльнасці "Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)" ВДУ імя П.М. Машэрава.

***ФГиЯК — не отставать от времени!***

Тэлеграм канал факультэта:
t.me/vsu_fhlc

Кантакты для сувязі:
+375 (29) 559-20-67
seliasen.k@mail.ry
(галоўны рэдактар часопіса)